


## ЗАХАВАЕМ РАЗАМ ТВП "БЯРЭЗІНА – ГАЙНА"!

Калі Вам неабыякавы лёс прыроды роднага краю, калі Вы маеце магчымасць наведваць поймы Гайны і Бярэзіны і кантраляваць іх стан або жадаеце іншым чынам садзейнічаць іх ахове, Вы можаце стаць адным з захавальнікаў ТВП "Бярэзіна – Гайна" і разам з намі паклапаціцца аб яе існаванні ў будучым.

**Захавальнікам ТВП можа стаць кожны аматар прыроды незалежна ад узросту, прафесіі і асабістых здольнасцей. З дапамогай захавальнікаў мы рэгулярна і аператыўна атрымліваем інфармацыю пра стан ТВП і пагрозы, якія на іх узнікаюць, праводзім практычныя мерапрыемствы для захавання гэтых тэрыторый і аднаўлення экасістэм.**

АБО СКАНІРУЙЦЕ

ЗАХОДЗЬЦЕ НА СТАРОНКУ

**www.iba.ptushki.org**

**або тэлефануйце: 8(017)263-06-13**

**Станавіцеся адным з захавальнікаў, назірайце за Тэрыторыяй, важнай для птушак. Паведамляйце нам пра пагрозы для ТВП і свае назіранні!**

ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"
(8017) 263-06-13
(8029) 223-06-13
(8029) 101-68-87
info@ptushki.org

www.fb.com/APB.BirdLife.Belarus
www.vk.com/ptushki
www.twitter.com/ptushki

**www.ptushki.org**

Coalition Clean Baltic

BirdLife INTERNATIONAL

Сетка захавальнікаў ТВП "Бярэзіна – Гайна" ствараецца ў рамках праекта "Развіццё і ўмацаванне сеткі захавальнікаў вакол значных водна-балотных угоддзяў" пры падтрымцы прыродаахоўнай асацыяцыі "Кааліцыя Чыстая Балтыка".

Фота: С. Левы, Э. Мангін, www.shutterstock.com

Тэрыторыі, важныя для птушак

# БЯРЭЗІНА–ГАЙНА



BirdLife IBA ТЭРЫТОРЫЯ ВАЖНАЯ ДЛЯ ПТУШАК



Чорная крычка

## ШТО ТАКОЕ ТВП?

Найбольш эфектыўным метадам аховы большасці рэдкіх і многіх звычайных відаў жывёл і раслін з'яўляецца захаванне каштоўных прыродных тэрыторый, неабходных для іх выжывання.

Тэрыторыя, важная для птушак (ТВП) – гэта тэрыторыя, якая адпавядае міжнародным або нацыянальным крытэрыям падтрымкі пэўнай часткі папуляцыі аднаго ці некалькіх відаў птушак падчас гнездавання, зімоўкі або міграцыі.

Зараз у праграме ТВП удзельнічаюць каля 200 краін свету, у якіх выдзелена больш за 11 000 ТВП. У Беларусі вызначаны 52 Тэрыторыі, важныя для птушак.




## ЦІКАВЫЯ ФАКТЫ ПРА ТВП "БЯРЭЗІНА – ГАЙНА":

1 ТВП «Бярэзіна – Гайна» з'яўляецца працягам Бярэзінскага біясфернага запаведніка. Тут пераважаюць нізінныя купістыя асаковыя балоты і паплавы.

2 Умовы, спрыяльныя для гнездавання і міграцыі водна-балотных птушак узніклі тут у многім дзякуючы гістарычнай сістэме гаспадарання: сенакашэнню, выпасу свойскай жывёлы.

3 Працягласць р. Гайны ў межах угоддзя складае 24 км, а р. Бярэзіны – усяго 12 км.



4 Тут гняздуюцца 2 глабальна знікаючыя віды птушак – вялікі арлец і вяртлявая чаротаўка, а таксама блізкія да іх па статусе вялікі грыцук і дубальт.

5 Вусце р. Гайна мае вялікае значэнне для адпачынку гусей, качак і кулікоў падчас веснавой міграцыі. На рачных плёсах тут штогод канцэнтруецца па некалькі тысяч водна-балотных птушак розных відаў.

6 У паляўнічых угоддзях ТВП «Бярэзіна – Гайна» на працягу 2013–2014 гадоў забаронена веснавое паляванне на ўсе віды гусей, качку-крыжанку і канадскую казарку.



Вялікі грыцук



## ШТО ПАГРАЖАЕ ТВП "БЯРЭЗІНА – ГАЙНА"?

- Зарастанне поймы хмызнякамі ў выніку спынення сенакашэння вядзе да змяншэння плошчы найбольш каштоўных балот і паплавоў.
- Выпальванне сухой расліннасці ў лясах і пойме перыядычна прыводзіць да пажараў.
- Верагоднасць торфараспрацоўкі, якая можа прывесці да страты ўнікальных прыродных умоў водна-балотнай тэрыторыі і яе біяразнастайнасці.
- Незаконнае паляванне і рыбная лоўля – таксама прычыны таго, што колькасць многіх відаў жывёл тут значна ніжэйшая за біялагічную ёмістасць угоддзя.

